*Савіцкая М. В.,*

навуковы супрацоўнік аддзела рамёстваў
і традыцыйнай культуры ДУ «Лідскі раённы
цэнтр культуры і народнай творчасці»

## ТРАДЫЦЫЙНЫЯ ВІДЫ РАМЁСТВАЎ: МОКРАЕ І СУХОЕ ВАЛЕННЕ



Гісторыя гэтага незвычайнага віду рукадзелля зыходзіць з далёкага мінулага. Валенне — найстаражытнейшая на зямлі тэхніка вырабу тэкстылю. Археолагі адзначаюць, што першыя валеныя вырабы ўзніклі каля 8 тысяч гадоў назад. Старажытныя людзі пачыналі валіць з поўсці дзікіх, а потым і прыручаных жывёл. І толькі потым яны навучыліся прасці, вязаць і вырабляць тканіны.

У Беларусі лямец з'явіўся пасля татара-мангольскіх набегаў. Значна пазней, каля 200 гадоў назад, у Беларусі навучыліся рабіць з шэрсці валёнкі. Але апроч валёнак выраблялiся таксама сукно, якое было досыць папулярным, лямцы для гаспадарчых патрэб і валеныя шапкі.

Майстэрства валення з шэрсці перадавалася ад пакалення да пакалення. У тэхніцы валення і праз шмат гадоў практычна нічога не змянілася. Аднак у наш час выводзяць новыя пароды авечак — мерыносавыя. Яны славяцца тонкай і мяккай шэрсцю, з якой можна атрымаць надзвычай далікатныя вырабы.

Працаваць з шэрсцю займальна і вельмі прыемна: гэта мяккі і цёплы матэрыял.

Валіць шэрсць можна двума спосабамі — мокрым і сухім.

**Мокрае валенне** — валенне рукамі з дапамогай вады і мыла. Шэрсць раскладваюць пластамі, насычаюць яе мыльным растворам і пагладжваюць рукамі, паступова павялічваючы сілу націскання. Пад уплывам шчолаку і ўздзеяннем рук валокны шэрсці шчыльна пераплятаюцца, у выніку атрымліваецца лямец.

**Сухое валенне** — ушчыльненне шэрсці з дапамогай адмысловых іголак. Гэты спосаб з'явіўся значна пазней мокрага, але ў наш час заваёўвае ўсё большую папулярнасць. Такая тэхніка дазваляе ствараць аб'ёмныя вырабы, у прыватнасці цацкі, фігуркі, лялькі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Іголкі маюць своеасаблівыя насечкі, дзякуючы якім яны падчапляюць і змешваюць (блытаюць) валокны шэрсці. Усе насечкі напраўлены ў адным кірунку, процілеглым кірунку ўтыкання. Таму іголку можна лёгка выняць з шэрсці. Утыкаючы шмат разоў іголку ў шэрсць, змешчаную, напрыклад, на паралонавай губцы, шэрсць звальваюць, дамагаючыся патрэбнай формы (пры аб’ёмным валенні) ці таўшчыні ваўнянага пласта (пры валенні плоскіх дэталей).









З няпрадзенай шэрсці можна зрабіць як простыя (пацеркі, кветкі), так і складаныя (торбы, карціны/пано, вопратку) вырабы.

Паспрабуем папрацаваць у тэхніцы. Пачнём з простага вырабу — з пацерак. Для вырабу іх акрамя шэрсці спатрэбяцца: іголкі для валення, ніткі (для дэкору), паралонавая губка ці шчотка для падкладкі.

Каб скачаць пацерку, вазьміце не вельмі тоўстую пасмачку шэрсці даўжынёй каля 10 см, згарніце яе ў клубочак, пакачайце крыху паміж далонямі і пакладзіце на паралон. Акуратна прытрымліваючы пальцамі загатоўку, каліце яе ў розныя месцы іголкай для валення, ледзь пракручваючы то ў адзін бок, то ў другі. Калі шарык ушчыльніцца і крыху зменшыцца ў аб’ёме, адкладзіце яго ўбок і рабіце наступны — пакуль не атрымаеце столькі, колькі вам трэба.

Шарыкі могуць атрымацца крыху рознымі: адзін — крыху большы, другі — крыху меншы, трэці — і не шарык зусім, а нейкі эліпс…

Наступны этап працы — выраб аднолькавых па памеру шарыкаў. Выберыце самы буйны з іх, ён будзе для нас эталонам. Тыя, што не выйшлі велічынёй, абгортваем тонкімі пасмачкамі шэрсці і тыкаем у іх іголкай, пакуль кожны не стане такім, як эталонны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Няроўныя і недастаткова круглыя шарыкі выпраўляем, прывальваючы лямец да «бракаваных» бакоў.

У наш час валенне шэрсці перажывае новы віток у сваім развіцці. Сёння гэта ўжо не жыццёва патрэбнае рамяство, а яркая форма мастацкага выражэння. Сучасныя майстры не толькі выкарыстоўваюць усе прыёмы валення, якія засталіся ад продкаў, але і прыдумваюць новыя. Робяцца моднымі лямцавыя цацкі і карціны, адзенне і аксесуары, упрыгажэнні і розныя прадметы інтэр'ера. Лямец выкарыстоўваюць у спалучэнні са шклом, металам, керамікай. На нашых вачах развіваецца тэхналогія валення, робяцца даступнымі матэрыялы і прылады для гэтага віду рамяства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ